# ВОДЗЫЎ

на аўтарэферат дысертацыі

**Селях Аксаны Аляксандраўны**

**“Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. ХХ ст”,**

прадстаўленай на атрыманне вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія

У сучасным сацыяльна-гуманітарным навуковым дыскурсе назіраецца заканамерны рост увагі да пытанняў паўсядзённага жыцця, паўсядзённай культуры, якая з’яўляецца сацыяльна дыферэнцыраванай, прычым адрозненні выяўляюцца праз формы жыцця, якія Р. Бауман назваў “неаплемянамі”. Гендарнае даследаванне трансфармацыі паўсядзённага жыцця на канкрэтным вернакулярным матэрыяле – надзвычай важны аспект сучаснага навуковага дыскурсу (у тым ліку этналогіі, культурнай антрапалогіі). Этнаграфічнае даследчае поле сёння разглядаецца не проста як абмежаваная прастора, а як феномен, створаны на аснове дынамічных (якія ўвесь час упарадкоўваюцца) інтэракцый паміж этнолагам і яго “аб’ектам” даследавання, прычым “інфарманты” і “збіральнікі” разглядаюцца ў іх узроставай і гендарнай адметнасці.

Гендарны і ўзроставы паказчыкі выступаюць адмысловымі фундаментальнымі катэгорыямі навуковай інтэрпрэтацыі культурнага вопыту і спецыфікі яго ўвасаблення ў паўсядзённым жыцці. Іх улік адмаўляе існаванне нейкага ўніверсальнага “паўсядзённага жыцця”. У такіх абставінах узрастае актуальнасць выкарыстання антрапалагічнага (у тым ліку гендарнага) падыходу да даследавання паўсядзённага жыцця і яго трансфармацыі. Не выклікае сумневу перспектыўнасць антрапалагічна скіраванага міждысцыплінарнага даследавання дынамікі паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат на канкрэтным вернакулярным матэрыяле (у прыватнасці, Заходняга Палесся 1920–1980-х гг.).

Навуковая навізна дысертацыйнай працы Селях Аксаны Аляксандраўны абумоўлена выкарыстаннем шырокага палявога матэрыялу і грунтоўнай тэарэтычнай базы. Аўтар сістэмна разгледзела канцэпт “дзявоцтва”, вызначыла паняцці “дзявочая паўсядзённасць”, “трансфармацыя дзявочай паўсядзённасці”, раскрыла дынаміку грамадскіх статусных і ролевых пазіцый дзяўчат.

У прадстаўленай рабоце ўпершыню ўсебакова раскрыта сутнасць змен становішча беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат у сям’і. Абгрунтавана, што логіка ўнутрысямейных зносін (з бацькамі і дзядамі, паміж дзецьмі), становішча ў сям’і, выхаваўчыя метады і напрамкі адпавядалі ўзростава-статусным перыядам “дзіця – дзяўчынка – дзяўчына (дзеўка)”. Істотным элементам дысертацыйнай працы з’яўляецца даследаванне падыходаў да выхавання дзяўчат, а таксама вызначэнне ўплывовых на іх фактараў (структура сям’і (наяўнасць абодвух бацькоў, наяўнасць братоў,

сясцёр), узровень матэрыяльнага становішча сям'і, канфесійная прыналежнасць).

Пагодзімся з тым, што становішча дзяўчыны ў сельскім грамадстве на працягу 20–80-х гг. XX ст. было падпарадкавана сацыяльнай іерархіі, якая існавала ў вёсцы і была заснавана на полаўзроставай і статуснай стратыфікацыі. Разгляд дашлюбных паводзін беларускіх заходнепалескіх сельскіх дзяўчат дазволіў дысертантцы прыйсці да слушнай высновы, што "асаблівасці дашлюбнага жыцця дзяўчат у перыяд 20–80-х гг. XX ст. рэгуляваліся нормамі традыцыйнай культуры, сярод якіх асноўнымі былі захаванне цноты, асуджэнне абортаў, арыентацыя на замужжа і дзетанараджэнне. Трываласць хрысціянскай светапогляднай мадэлі садзейнічала кансервацыі традыцый у культуры дашлюбных міжпалавых адносін" (с. 7). Падобныя назіранні на матэрыяле Заходняга Палесся 1920–1980-х гг. нам таксама даводзілася адзначаць (гл., напрыклад, раздзел калектыўнай манарафіі НАН РБ: Швед І.А. Беларускае традыцыйнае вяселле // Нарысы гісторыі культуры Беларусі. У 4 т. Т. 3. Культура сяла XIV – пачатку XX ст. кн. 2. Духоўная культура / А. І. Лакотка [і інш.]; навук. рэд. А. І. Лакотка. – Мінск : Беларуская навука, 2016. – С. 345–441 і інш.).

Упершыню ў айчыннай навуцы былі вызначаны характэрныя рысы трансфармацыі культуры дашлюбных паводзін дзяўчат, выяўлены асаблівасці культуры жыццезабеспячэння і яе ўплыву на дзявочую штодзённасць. Дысертанткай сістэмна разгледжаны пытанні, што былі недастаткова вывучаныя ў беларускай этналогіі, сярод якіх: фарміраванне рукапіснай культуры сельскіх дзяўчат і культуры дзявоцтва ўвогуле, працоўныя стратэгіі ў штодзённым жыцці сельскіх дзяўчат, традыцыі баўлення вольнага часу, уплыў родавых уяўленняў на становішча дзяўчыны ў сельскім соцыуме і інш.

Навуковыя палажэнні, якія Селях Аксана Аляксандраўна выносіць на абарону, у поўнай меры адлюстроўваюць ступень навізны даследавання, уяўляюцца значнымі і абгрунтаванымі.

Аўтарэферат адлюстроўвае структуру дысертацыйнай работы, раскрывае значэнне тэрмінаў, якімі карыстаецца аўтар і якія прапаноўвае ўпершыню. Пададзенае ў аўтарэфераце агульнае апісанне этнаграфічнага матэрыялу сведчыць пра вялікі аб'ём палявой і аналітычнай працы, праведзенай даследчыцай.

Адзначу таксама грунтоўную апрабіраванасць тэарэтычных і практычных вынікаў дысертацыйнай працы на міжнародных і рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях і ў публікацыях аўтара, што дазваляе казаць пра навуковую вывераннасць і аб'ектыўнасць высноў.

Перспектыўным бачыцца выкарыстанне атрыманых матэрыялаў і вынікаў для антрапалагічнага даследавання культурна-сімвалічных сістэм і іх каштоўнаснай кампаненты, спецыфікі традыцыйных узораў паводзінаў, ментальных, эмацыйных уласцівасцей дзяўчат і жанчын, канкрэтных рэгіянальных традыцый у пэўны часавы прамежак айчыннай гісторыі, а таксама псіхалогіі памяці і спосабаў трансляцыі пэўнага вопыту.

Праца можа паспрыяць нараджэнню новых перспектыўных навуковых

праектаў Рэспублікі Беларусь у сферы інтэрпрэтацыі разнастайнасці паўсядзённага жыцця розных сацыяльных груп і адметнасцей іх культурнай рэальнасці, разгледжанай у дынаміцы.

Такім чынам, паводле аўтарэферата, дысертацыя Селях Аксаны Аляксандраўны “Трансфармацыя паўсядзённага жыцця беларускіх сельскіх дзяўчат у Заходнім Палессі ў 20–80-я гг. XX ст.” абапіраецца на грунтоўную фактaлагічную (у вялікай частцы самастойна зафіксаваную) і тэарэтычную базу, мае лагічную структуру, адлюстраваную ў аўтарэфераце, з’яўляецца паслядоўнай, аргументаванай. Дысертацыйнае даследаванне Селях Аксаны Аляксандраўны адпавядае спецыяльнасці 07.00.07 – этнаграфія, этналогія і антрапалогія, а яго аўтар заслугоўвае прысваення вучонай ступені кандыдата гістарычных навук па адзначанай спецыяльнасці.

Даю згоду на размяшчэнне водзыва на аўтарэферат дысертацыі Селях Аксаны Аляксандраўны ў глабальнай сетцы Інтэрнэт.

Доктар філалагічных навук, прафесар,
прафесар кафедры нямецкай філалогіі
і лінгвадыдактыкі УА “Брэсцкі дзяржаўны
ўніверсітэт імя А.С. Пушкіна” І.А. Швед

08.06.2026 г.

Установа адукацыі «Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт імя А.С.Пушкіна»
АДДЗЕЛ КАРПАРАТЫЎНАГА АДМІНІСТРАВАННЯ І ПРАВАВОЙ ПРАЦЫ

Подпись
подтверждаю
Начальник отдела корпоративного
администрирования и правовой работы
(подпись, расшифровка подписи)
«08» 06 2026 г.